Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна -педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ
(гутарка)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Задачы: развіваць цікавасць да роднага краю, нацыянальнай культуры; замацоўваць уяўленні пра дзяржаўнае свята - Дзень перамогі.

Ход гутаркі:

Выхавальнік: Якое свята адзначае наша краіна 9 мая? (Дзень Перамогі). Гэта свята, якое адрозніваецца ад усіх іншых. У гэты дзень мы радуемся за тое, што нашая краіна стала свабоднай і атрымала перамогу над фашысцкімі захопнікамі. І ў той жа час мы сумуем аб тых людзях, якія абараняючы нашу Радзіму загінулі. У гэты дзень аддаецца даніна павагі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. 9 мая ветэраны і іх блізкія збіраюцца разам, успамінаюць сваіх франтавых сяброў і былыя подзвігі.

У гэтым годзе мы святкуем 77-ю гадавіну Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У 1941 годзе пачалася вайна паміж нашай краінай і фашысцкай Нямеччынай. Як вы думаеце, для чаго на нашу краіну напалі фашысты? (Адказы дзяцей).

Выхавальнік: Правільна, яны хацелі захапіць нашу краіну і зрабіць усіх жыхароў сваімі рабамі. Але смелы, адважны наш народ не даў гэтага зрабіць. Як вы думаеце, хто абараніў нашу краіну ад ворагаў? (Адказы дзяцей).

Выхавальнік: Нашу Радзіму абаранялі не толькі мужчыны-салдаты, але і жанчыны. Жанчыны-воіны з гонарам выконвалі свой абавязак ва ўсіх родах войскаў. За час вайны яны сталі лётчыцамі, танкістамі, зенітчыцамі, кулямётчыцамі, разведчыцамі, снайперамі, сувязісткамі, медсёстрамі. Хоць і не жаночая гэта справа ваяваць, але яны адважна ваявалі з ворагам. Вельмі шмат жанчын сталі героямі нашай краіны. Яны былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Пакуль ішла вайна з ворагам на полі бою, астатнія людзі: жанчыны, старыя і дзеці працавалі на заводах і палях. Яны выраблялі зброю і ўсе неабходныя рэчы, а таксама вырошчвалі і нарыхтоўвалі прадукты харчавання. Усе жыхары нашай краіны імкнуліся дапамагчы войскам. Кожны рабіў усё, што мог для Перамогі. Дзеці працавалі нароўні з дарослымі, імкнуліся дапамагчы дарослым.






ОБОРОНУ
ГОРОДА



Доўгіх чатыры гады ішла жорсткая і бязлітасная вайна, але наш беларускі  народ выстаяў і 9 мая 1945 гады атрымаў перамогу над войскамі Нямеччыны. Дзякуючы таму, што жыхары нашай краіны былі дружнымі, адважнымі і любілі сваю краіну, яны атрымалі перамогу і не далі ворагу захапіць нашу краіну. Няма ў Беларусі сям’і, якую б не закранула вайна.

Выхавальнік: Дзеці, як называюць людзей якія абаранялі нашу краіну падчас вайны? (Адказы дзяцей).

Выхавальнік: У памяць  пра страшныя дні вайны людзі стваралі помнікі, пісалі песні і вершы, малявалі карціны. Сёння мы з вамі таксама намалюем малюнкі прысвечаныя “Дню Перамогі”

Дзеці малююць малюнкі.


9 мая
С Днем Победы